2. Цейтлин, С. Н. Язык и ребёнок: Лингвистика детской речи / С. Н. Цейтлин. – М. : Владос, 2000. – 238 с.
3. Матюшкин, А. М. Проблемные ситуации в мышлении и обучении / А. М. Матюшкин – М. : Директ-Медиа, 2008. – 320 с.

# МАЎЛЕНЧА-КАМУНІКАТЫЎНЫЯ ПРАКТЫКАВАННІ ЯК ЭФЕКТЫЎНЫ СРОДАК РАЗВІЦЦЯ МАЎЛЕННЯ ВУЧНЯЎ НА ЎРОКАХ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ І ЛІТАРАТУРНАГА ЧЫТАННЯ

**Кардаш Дзіяна (УА МДПУ імя І. П. Шамякіна, Беларусь)**
**Навуковы кіраўнік – Б. А. Крук, канд. філал. навук, дацэнт**

Псіхалагічная прырода маўлення, праблемы яго станаўлення і развіцця раскрываюцца ў шматлікіх псіхалагічных даследаваннях (Л. С. Выготскі, Н. І. Жынкін, І. А. Зімняя, А. А. Лявонцьеў, А. М. Леўшына, А. К. Маркава, С. Л. Рубінштэйн, А. Г. Рузская, Ф. А. Сохін, Д. Б. Эльконін і інш.).

Псіхалагічны аспект развіцця маўлення абапіраецца на палажэнне Л. С. Выгоцкага, аб тым што развіццё маўлення цесна звязана з развіццём мыслення і свядомасці. Разглядаючы праблему фарміравання паняццяў, Л. С. Выгоцкі пісаў, што назапашванне асацыяцый і груп уяўленняў не прыводзіць да іх утварэння, «паняцце немагчыма без слоў, мысленне ў паняццях немагчыма па-за маўленчым мысленнем».

Асноўнай педагагічнай вартасцю маўленчых практыкаванняў з'яўляецца настрой дзяцей на працу, прывіццё пэўнай культуры карыстання маўленчым апаратам, выхаванне ў вучняў пачуцця адказнасці за тое, што яны гавораць і як гавораць.

Маўленча-камунікатыўныя практыкаванні уключаюць у сябе: дыхальныя практыкаванні, артыкуляцыйныя практыкаванні, практыкаванні на развіццё дыкцыі [1, с. 25].

Мэта дыхальных практыкаванняў – спрыяць выпрацоўцы правільнага дыяфрагмальнага дыхання, працягласці выдыху, яго сілы і паступовасці. Да найбольш распаўсюджанных і эфектыўных прыкладаў такіх практыкаванняў адносяцца:

*1.* “***Свечка”.*** Устаць, прыняць зыходнае становішча, зрабіць глыбокі ўдых носам, затрымаць дыханне і выдыхнуць ротам, задзьмуваючы ўяўнае полымя свечкі (можна выкарыстоўваць палоску паперы і дзьмуць на яе так, каб яна адразу апусцілася ўніз).

*2. «Снег».* Дзіцяці прапануецца падзьмуць на вату, дробныя паперкі, пушынкі, каб стварыць «мяцеліцу». Яго вусны павінны быць акругленыя і злёгку выцягнутыя наперад. Пры выкананні гэтага практыкавання пажадана не надзімаць шчокі.

На практыцы я назірала, як выкарыстоўваліся практыкаванні “Кароўка”, “Пазнай па паху”, “Наматай клубочак”, “Снег ідзе”, “Завіруха”, “Апусканне пад ваду”.

Мэта артыкуляцыйнай гімнастыкі – умацаванне мышцаў артыкуляцыйнага апарата. Практыкаванні на артыкуляцыю:

1. ***“Блінчык”.*** Усміхнуцца, адкрыць рот. Пакласці язык на ніжнюю губу. Утрымліваць у спакойным стане да пяці секунд.

2. ***«Лапата».*** Шырока адкрываем рот. Кладзём мяккі спакойны язычок на ніжнюю губу. Затрымліваем на 5 секунд. Прыбіраем язычок. Даць вучню час для адпачынку і паслаблення. Паўтараць практыкаванне мэтазгодна тры разы.

У час практыкі выкарыстоўваліся артыкуляцыйныя практыкаванні “Гадзінічкі”, “Чысцім зубкі”, “Хамячок”, “Котка хлебча малако”, “Кубачак”, “Арэлі”, “Іголачкі”, “Смачны мёд”, “Масток”, “Хабаток”.

Практыкаванні на развіццё дыкцыі вучаць выразна вымаўляць спалучэнні гукаў, якія адрозніваюцца, умець чуць артыкуляцыйныя недахопы ў сваім і чужым маўленні [2, с. 40].

У перыяд перaддыпломнай практыкі на базе ДУА “Сярэдняя школа № 11 г. Мазыра” мы актыўна уключалі маўленча-камунікатыўныя практыкаванні, каб выявіць узровень развіцця маўлення вучняў.

Для вывучэння эфектыўнасці практыкаванняў, накіраванных на развіццё маўлення, намі было праведзенна даследаванне з вучнямі 3 класса, у ходзе якога ўдзельнічалі 32 навучэнцы.

Для даследавання былі выкарыстанны маўленча-камунікатыўныя практыкаванні. Аналіз вынікаў дыягностыкі паказаў станоўчую дынаміку. Амаль усе вучні выканалі заданні правільна, у адпаведнасці з характарыстыкай. Колькасць вучняў з высокім узроўнем развіцця маўлення склала 62 %, з сярэднім – 31 %, а з нізкім толькі 7 %.

Гэта сведчыць аб тым, што выкарыстанне маўленча-камунікатыўных практыкаванняў на ўроках мовы і чытання з’яўляецца эфектыўным, паколькі яны дазваляюць выхоўваць у вучняў пэўную культуру карыстання маўленчым апаратам і пачуцце адказнасці за тое што яны гавораць, і за тое, як яны гавораць.

Спіс выкарыстанай літаратуры

1. Савова, М. Р. Для чего нужна речевая разминка на уроках риторики? // Начальная школа. – 2009. – № 10. – С. 25–28.

2. Зорина, Л. Н. Речевые разминки – средство обогащения речи школьника // Начальная школа. – 2011. – № 5. – С. 40 – 43.

## ФАРМІРАВАННЕ МАЎЛЕНЧАЙ КУЛЬТУРЫ МАЛОДШЫХ ШКОЛЬНІКАЎ НА ЎРОКАХ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ Ў ПАЧАТКОВЫХ КЛАСАХ

**Карунас Ганна (УА БрДУ імя А. С. Пушкіна, Беларусь)**
**Навуковы кіраўнік – М. Р. Гарбачык, канд. філал. навук, дацэнт**

Маўленне – спосаб пазнання рэчаіснасці. Менавіта маўленне выконвае функцыі зносінаў і паведамлення, эмацыянальнага самавыражэння і ўздзеяння на іншых людзей. Добра развітае маўленне служыць адным з галоўных сродкаў актыўнай дзейнасці чалавека ў сучасным грамадстве, а для малодшых школьнікаў – сродкам паспяховага навучання ў школе. Аднак вуснае, пісьмовае маўленне навучэнца знаходзіцца на невысокім узроўні: бедны слоўнікавы запас, немагчымасць дакладна, граматна выразіць свае думкі,